# Цэнтр па папулярызацыі народнага мастацтва

***17 кастрычніка ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» пад гукі музыкі ў выкананні творчага калектыву «Амадэус» адбылося ўрачыстае адкрыццё мастацкай выстаўкі «З творчасцю па жыцці». Яна стала першай імпрэзай у шэрагу мерапрыемстваў, прысвечаных 15-годдзю галерэі.***

У экспазіцыю ўвайшлі творы жывапісу, графікі, баціка, акварэлі, маляванкі, вырабы з тэкстылю, керамікі, саломкі, шкла ды іншых матэрыялаў. Сярод экспанентаў – педагогі, студэнты, выпускнікі кафедры народнага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКіМ). Гэта мэтры педагагічнай справы Рыгор Шаура, Уладзімір Гардзіенка, Уладзімір Рынкевіч, Аляксандр Кавалёў, вядомыя ў краіне майстры дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Тамара Васюк, Ала Непачаловіч, Людміла Дамнянкова, стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Наталля Аджзер, Алена Шаціла, Вольга Краўчук, Святлана Шляпікава, лаўрэаты моладзевых Дэльфійскіх гульняў Дзяржаваў – удзельнікаў СНД Кацярына Семечка і Настасся Люцько, дыпламанты міжнародных конкурсаў і фестываляў мастацтваў Арцём Мачульскі, Ірына Ермаковіч, Юлія Чаркесава, Крысціна Гурыновіч, Аляксандра Пармон, пераможцы рэспубліканскіх выставак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Ганна Навіцкая і Ірына Валынец, мастацкіх выставак-конкурсаў маладых мастакоў Данута Валынец, сябры Беларускага саюза мастакоў, Беларускага саюза дызайнераў, Беларускага саюза майстроў народнай творчасці і інш.

На адкрыцці выступілі дырэктар галерэі Павел Сапоцька, прарэктар па навуковай працы БДКУіМ Віктар Языковіч, загадчык кафедры дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Р. Шаура, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры Тадэуш Стружэцкі, мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн, куратары выстаўкі дацэнты Т. Васюк і А. Непачаловіч, якія правадзілі першую выстаўку галерэі 15 гадоў таму. У аснову канцэпцыі юбілейнай экспазіцыі, падрыхтаванай імі ў рамках праекта «Настаўнікі – вучні», пакладзенае народнае мастацтва.



*Т. Стружэцкі*



*В. Колесава. «Крыж Ефрасінні Полацкай»*

Сардэчна віншуем калектыў галерэі, якая, па словах Т. Стружэцкага, за час існавання з навукова-метадычнай творча-адукацыйнай пляцоўкі кафедры народнага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва ператварылася ў адзін з вядучых не толькі ў сталіцы, але ва ўсёй Беларусі міжнародны культурна-асветніцкі і адукацыйны цэнтр па папулярызацыі народнага мастацтва краіны.

***Жадаем і надалей трымаць такі высокі ўзровень!***

*Наталі КУПРЭВІЧ*
*Фота аўтара*



*Т. Васюк. «Рагнеда»*



*К. Семечка. «Лики женственности»*



*П. Сапоцька і В. Языковіч*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ